# МАСЛЕНІЦА ІДЗЕ!



**Па гарызанталі: 1.** Дзень масленічнага тыдня, калі сваякі гасцявалі адно ў аднаго, а моладзь запрагала ў сані коней. **4.** Масленіца ідзе, блін ды ... нясе (прык.). **6.** Бліны — сонцу ... (прык.). **9.** ... вясны. Старажытны беларускі абрад, першае па часе веснавое свята. **11.** Дэкаратыўная дэталь японскіх баявых мячоў, якая адпавядае еўрапейскаму эфесу. **13.** «Ідзі, ..., да крынічкі! Ды забірай рукавічкі». Зварот да зімы ў час спалення масленічнага пудзіла. **16.** Блін не сноп, на ... не наколеш (прык.). **17.** Роды казы, авечкі, зайчыхі. **18.** Адзінка падліку выйгрышаў у спартыўных гульнях. **19.** Нетры зямлі, вады (перан.). **22.** Лішняе ... пры дойцы каровы псуе яе (прык.). **23.** Дзень масленічнага тыдня, калі зяці хадзілі да цешчаў на бліны. **25.** Народнае эпічнае апавяданне. **27.** Перапончатакрылае насякомае гарачых краін. **28.** У лютым два друга: ... і завіруха (прык.).

**Па вертыкалі: 1.** Лютаўскае ... свеціць, ды не грэе (прык.). **2.** Буйны горад на Віцебшчыне. **3.** Жаргон. **5.** Моцны крык з плачам. **6.** Лютаўскі ... вясною пахне (прык.). **7.** Мера зямельнай плошчы. **8.** Рака, левы прыток Заходняй Бярэзіны. **10.** Памяшканне для захоўвання пчол зімой. **12.** Блінцы, ..., бліны, як калёсы ў вясны (прык.). **14.** Невялікі брусочак сырковай масы ў расфасоўцы. **15.** Масленіца — палізуха: сыр і ... палізала (прык.). **20.** Пост падняў ..., а мне Масленіца (прык.). **21.** Прашчоны .... Назва масленічнай нядзелі, калі распальвалі вогнішча, вадзілі карагоды і прасілі адно ў аднаго прабачэння. **23.** Не ўсё кату Масленіца, бывае і вялікі ... (прык.). **24.** Мужчынскае імя. **25.** Майстар сваёй справы. **26.** Адзінка электрычнага супраціўлення.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.**

*г. Дзяржынск.*

**Праверце, калі ласка, адказы**
**Па гарызанталі:** 1. Субота. 4. Мёд. 6. Сваякі. 9. Гуканне. 11. Цуба. 13. Зіма. 16. Вілы. 17. Акот. 18. Ачко. 19. Лона. 22. Вока. 23. Пятніца. 25. Сказ. 27. Тэрміт. 28. Мяцель.
**Па вертыкалі:** 1. Сонца. 2. Орша. 3. Арго. 5. Ёкат. 6. Снег. 7. Ар. 8. Іслач. 10. Зімоўнік. 12. Блінчыкі. 14. Сырок. 15. Масла. 20. Хвост. 21. Дзень. 23. Пост. 24. Акім. 25. Спец. 26. Ом.

Даты | Падзеі | Людзі

## 25 ЛЮТАГА

**1790** год — дата нараджэння (в. Мурагі, цяпер у Расонскім раёне) Яна Баршчэўскага, беларускага і польскага пісьменніка, літаратуразнаўцы, выдаўца. Збіраў беларускі фальклор, апісваў курганы і гарадзішчы. У 1817 годзе пераехаў у Пецярбург, выкладаў лацінскую і грэчаскую мовы. Сустракаўся з А. Міцкевічам, Т. Шаўчэнкам, пад уплывам якога пачаў выкарыстанне і апрацоўку беларускіх народных легендаў і паданняў. Сярод твораў: балады «Русалка-зводніца», «Дзявочая крыніца», «Дзве бярозы», «Курганы», аповесць «Душа не ў сваім целе» і інш. Шырокую вядомасць атрымаў празаічны зборнік «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях», у якім выкарыстаў беларускія легенды і казкі, упершыню выказаў думку пра самабытнасць Беларусі. Арганізаваў літаратурны гурток, які аб'ядноўваў выхадцаў з Беларусі, выдаваў і рэдагаваў польскі альманах «Незабудка». Творы пісьменніка доўгі час распаўсюджваліся ў рукапісах або вусна, як народныя. Памёр у 1851 годзе.

**1912** год — нарадзіўся (в. Улукі, цяпер у Слаўгарадскім раёне) Іван Рыгоравіч Цішчанка, вучоны-хімік, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар хімічных навук, прафесар. Аўтар больш як 130 навуковых прац, 8 вынаходак. Даследаванні ў галіне арганічнага сінтэзу і рэакцыйнай здольнасці арганічных рэчываў. Памёр у 1987 годзе.

**1922** год — нарадзіўся (г. Рэчыца) Эдуард Баляслававіч Нордман, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камсамольска-маладзёжнага падполля і партызанскага руху ў Пінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, генерал-маёр. У Вялікую Айчынную вайну з канца чэрвеня 1941 года ў партызанскім атрадзе «Камарова» (В.З. Каржа), удзельнік першых баёў беларускіх партызан з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Пасля вайны на партыйнай, камсамольскай і савецкай рабоце, у органах дзяржаўнай бяспекі. Памёр у 2006 годзе.

**1956** год — адбылося ранішняе пасяджэнне XX з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Праграма з'езда ўжо была вычарпаная, калі М.С. Хрушчоў прапанаваў увазе дэлегатаў свой сенсацыйны даклад «Аб культе асобы і яго выніках». У дакладзе Хрушчоў выкладаў факты, якія выкрывалі І.В. Сталіна. Даклад быў сакрэтным. Але ўжо ў пачатку сакавіка брашура пад грыфам «не для друку» была разасланая па ўсіх партыйных арганізацыях. Такім чынам, «закрытасць» дакладу была ўмоўнай, хоць афіцыйна ён быў апублікаваны толькі ў 1989 годзе.



**1957** год — нарадзіўся (в. Іванаўка Касцюковіцкага раёна) Алесь Пісьмянкоў, беларускі паэт. Аўтар паэтычных зборнікаў «Белы камень», «Чытаю зоркі» і іншых. Пісаў нарысы, эсэ, творы для дзяцей. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. Памёр у 2004 годзе.

### Было сказана

**Янка СІПАКОЎ, паэт, празаік:**
*«Дарога заўсёды вядзе дадому, нават тая, якая толькі што выйшла з дому».*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.07 | 18.39 | 10.32 |
| Віцебск — | 7.59 | 18.26 | 10.27 |
| Магілёў — | 7.57 | 18.29 | 10.32 |
| Гомель — | 7.51 | 18.28 | 10.37 |
| Гродна — | 8.22 | 18.55 | 10.33 |
| Брэст — | 8.20 | 18.58 | 10.38 |

### Месяц

***Маладзік 26 лютага. Месяц у сузор'і Вадалея.***

### Імяніны

***Пр.** Пачатак Вялікага Паста. Марыі, Аляксея, Антона, Мялеція, Яўгена.*
***К.** Анастасіі, Віктара, Цэзара, Ярaслава.*




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Можа быць, вяселле абылося б і без бойкі, але маладыя пачалі адкрываць канверты.**

Першае спатканне:
— Навошта ты туфлі на абцасах надзела? Ледзь ідзеш!
— Я падумала, што табе падабаюцца высокія дзяўчаты...
— Не, мне падабаюцца разумныя...
— Для гэтага я надзела акуляры.

**Калі вельмі хутка бегчы міма карцін Айвазоўскага, атрымаецца мульцік пра мора.**

Муж, назіраючы, як жонка раскладвае касметыку, надумаў высветліць, што і для чаго ёй трэба. Жонка:
— Ну вось глядзі: спачатку мыюся пенкай, потым — скраб, далей тонік, крэм, аснова для макіяжу, танальны крэм, а затым пудра.
— А навошта ўсё гэта?
— Каб атрымаўся натуральны колер твару.



Малюнак Вікенція ПУЗАНКЕВІЧА і Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 704.
Нумар падпісаны ў 19.30 24 лютага 2017 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12